***Сяргей Мацюшонак***

**МАЦІ, СЯБАР, НАСТАЎНІЦА**

«*О край песняплынны, скарбонка бясконцых надзей! /Багаты, і шчодры, і слынны – ты ў сэрцах жывеш у людзей...*» – чытаў я некалі і памятаю, як уразілі мяне гэтыя радкі, калі я ўпершыню прачытаў іх у школьным сачыненні маёй старэйшай сястры Алёны. Я спачатку падумаў, што гэта яна напісала такі прыгожы верш. Але аказалася, што гэта радкі з верша нашага мясцовага паэта Янкі Лайкова, які прысвечаны роднай вёсцы, дзе нарадзіўся Янка, - Новай Мётчы. Якраз у гэтай вёсцы знаходзіцца школа, якую закончыла мая сястра, зараз студэнтка БДТУ, дзе вучуся я і дзе вучыліся ў свой час мае бацькі – Мацюшонак Аляксандр Рыгоравіч і Галуза Святлана Мікалаеўна. Яны спачатку закончылі васьмігодку ў суседняй вёсцы Дроздзіна,
а затым два гады наведвалі Мётчанскую сярэднюю школу.

А нарадзіліся ўсе мы і жывём у невялічкай вёсачцы Антаневічы, якая для мяне таксама «край песняплынны, скарбонка бясконцых надзей». Мясцовыя краязнаўцы сцвярджаюць, што яна існуе вельмі даўно. Адкуль пайшла назва вёскі, сучасныя жыхары дакладна не памятаюць. Магчыма, першым пасяліўся тут Антон, а можа, Антаневіч (такое прозвішча сустракаецца ў нашых краях), а пасля дзеці яго жылі тут – і пакінулі памяць аб сабе ў назве вёскі.

Вёсачка наша вельмі прыгожая. Знаходзіцца яна за некалькі соцень метраў ад суседняга Дроздзіна. Як толькі выязджаеш з Дроздзіна, адразу за паваротам, на ўзвышшы, адкрываецца роўненькі шнурочак антаневіцкіх хат. Мне вельмі падабаецца апісанне нашай вёскі у сачыненні маёй сястры, пра якое я ўжо згадваў. Лепш не скажаш: «Раней Антаневічы былі скрозь акружаны балотамі. Толькі з боку вёскі Леванова рос лес.Аднак пачалася актыўная меліярацыя, і балоты асушылі. Знікла дрыгва, маленькія балотныя вочкі-азярцы, а разам з імі і тыя жывёлы і птушкі, якія за доўгія стагоддзі прызвызаіліся да нашых мясцін. Адсунуліся далей і зараснікі хмызняку, і кусцікі дурніц, і танклявыя нітачкі журавін, якія спрадвеку раслі адразу за вёскай. Не даносіцца ўлетку да вёскі пах багульніку. Не выюць у піліпаўку галодныя ваўкі. Затое ранняй вясною пачынаюць гуркатаць на саўгасных палетках трактары, а змаўкаюць яны толькі глыбокай восенню, калі зямля засынае да новай вясны…».

Спачатку на месцы асушаных балот была арганізавана здабыча торфу. І жыхары нашай вёскі працавалі на торфаперарацоўцы. Спачатку выраблялі «торф» – паліва, якое выкарыстоўвалі для ацяплення на месцы. Затым торф пачалі вывозіць у вёску Ганцавічы для вырабу брыкету. Выкарыстоўвалі торф і для ўгнаення палёў.

Мае бацькі расказваюць, як вельмі весела было тады вясковым хлопчыкам і дзяўчынкам. Яны хадзілі зімою на тарфяныя горы-караваны і каталіся з іх, нібы з трампліну якога.

Славілася вёска Антаневічы сваімі цеслярамі, якія пабудавалі шмат хат у сябе і ў суседзяў. Гэта і Сакавец Аляксандр Фёдаравіч, і Сусолкін Васіль Андрэевіч, і Бабіцкі Міхаіл Міхайлавіч. Вядомым майстрам-сталяром быў Шынкевіч Ілья Нікіфаравіч. Яшчэ і зараз жыхары вёскі пазіраюць у вокны, зробленыя рукамі гэтага чалавека, і сядзяць на табурэтках і лавах, якія змайстраваў ён. Да гэтага часу карыстаецца попытам майстэрства мясцовага печніка Сакаўца Пятра Сафронавіча.

Менавіта ў нашай невялічкай вёсачцы нарадзіўся і вырас некалі вядомы праваслаўны святар Алексій Шынкевіч – Аляксей Рыгоравіч Шынкевіч. Ён, як і мае бацькі, вучыўся ў нашай Мётчанскай школе, а калі святкавалі яе 110-годдзе, прыязджаў на сустрэчу з землякамі.

Я ганаруся тым, што нарадзіўся тут, адкуль ідзе мой род. Захапляюся маімі бацькамі, якія не з’ехалі ў свой час у горад, як зрабілі большасць іх равеснікаў, а пабудавалі дом у Антаневічах і жывуць у ім па спрадвечных правілах, па якіх жылі нашы продкі. Асаблівым маім гонарам і любоўю з’яўляецца мама, Мацюшонак Святлана Мікалаеўна.

…Нарадзілася мая мама 29 студзеня 1971 года. Яна была малодшай у невялікай сям’і. Брат Саша быў старэйшы за яе на 5 гадоў. Яе бацька, а мой дзядуля Галуза Мікалай Аляксеевіч, 1941 г.н., працаваў на торфабрыкетным заводзе «Ганцавічы» трактарыстам. Бабуля Галуза Валянціна, 1943 г.н., была адмысловым паляводам і жывёлаводам брыгады «Дроздзіна» саўгаса «Мётча».

Дзіцячага садка ў вёсцы не было, таму маленькую Светку, маю маму, гадавалі суседскія бабулі, пакуль маці была на працы. Яны і песні ёй спявалі, і казкі расказвалі, і пра мінулае ўспаміналі. Да гэтага часу памятае мама і бабу Вольку, або, як казалі ў вёсцы, Петранчыху (муж яе Пётра быў невысокага росту, таму звалі яго Петранок), і бабу Прузынку, і бабу Марфу.

Сваё дзяцінства мама ўспамінае з цеплынёй. Вельмі любіла яна хадзіць з братам Сашам у ягады і грыбы, разам з ім вудзіла рыбу. Брат і сястра ведалі ў лесе лепшыя ягадныя і грыбныя мясціны, таму першыя дарункі лесу былі перш у іх кошыках. Яны лічылі лес найлепшым адпачынкам, бо працы ў вёсцы заўсёды хапала. Трэба было і кароў дагледзець (іх заўсёды было ў гаспадарцы дзве), і цялятак напаіць, і трусам есці даць, і гусі папасвіць. Акрамя таго, дапамагалі матулі браць лён (раней гэта рабілі ўручную), палоць дзялкі буракоў і бручкі, сушыць сена.

Летнімі вечарамі гулялі з вясковымі дзецьмі ў «выбівалы», у «пікара» і «штандара», палілі вогнішчы і смажылі сала з цыбуляй, пяклі ў прысаку бульбу. І здавалася гэта дзецям найсмачнейшым ласункам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

Узімку каталіся на лыжах і санках з тарфяных караванаў, будавалі снежныя крэпасці , капалі ў снезе зямлянкі.

Мама мая наведвала існуючую тады Дроздзінскую васьмігодку. Вучоба давалася ёй лёгка. Менавіта ў школе, яшчэ ў першым класе, пазнаёмілася яна з маім будучым татам Сашам Мацюшонкам. Першая настаўніца пасадзіла іх побач на апошнюю парту, і з таго часу на працягу васьмі год (зараз гэта называецца базавая школа) яны прасядзелі разам. Спачатку не ладзілі, а затым з'явілася сімпатыя…

Першая настаўніца маіх бацькоў, Ніна Віктараўна Зінкевіч, была ідэалам для маёй мамы. Яна зараз на пенсіі, жыве разам з мужам, былым дырэктарам былой Дроздзінскай школы Адамам Ціханавічам Зінкевічам, у вёсцы Дроздзіна. Дзякуючы Ніне Віктараўне мая мама выбрала для сябе настаўніцкую прафесію і ўпэўнена ішла да сваёй мэты.

У 1990 годзе мама скончыла Барысаўскае педагагічнае вучылішча і прыйшла працаваць настаўніцай пачатковых класаў у Мётчанскую сярэднюю школу. Праз год яна выйшла замуж і стала Мацюшонак Святланай Мікалаеўнай. Яшчэ праз год з'явілася ў мамы дачушка Аленка, а ў 2000 годзе я , сын Сяргей. Ужо гадуючы нас, мама завочна скончыла Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт.

Я вельмі люблю сваю мамачку. Яна разумная, чулая, прыгожая і клапатлівая. У мамы незвычайна прыгожы голас. Яшчэ з маленства чуў я мамін голас у калыханках і песнях. З матуліных вуснаў пачуў я родную мову, адчуў моц беларускага слова. Мая мама – сапраўдны патрыёт беларускай мовы, бо па-беларуску яна размаўляе і ў школе, і дома. Вось ужо больш за дваццаць год яна вучыць малодшых дзяцей. 1 верасня наш дом патанае ў кветках, якія дораць маме ўдзячныя вучні і іх бацькі. Маму паважаюць калегі па працы, у яе шмат сяброў. І я часта здзіўляюся: як паспявае мама быць і добрай гаспадыняй, і клапатлівай жонкай і мамай, і высокапрафесіянальнай настаўніцай?

А яшчэ я ганаруся тым, што мая мама не толькі падтрымлівае мяне ў імкненні спазнаць народную культуру і мастацтва ( я ўдзельнік ўзорнага фальклорнага гурта «Берагіня»), але і сама даследуе мясцовую краязнаўча-культурную спадчыну. Некалькі год назад яна вывучала такі від умельства як выцінанка, займалася гэтым з вучнямі і шукала звесткі аб ужыванні выцінанкі ў нашай мясцовасці. Пасля занялася вывучэннем мясцовай народнай прозы і яе ўплывам на выхаванне дзяцей. Менавіта мая мама ў далёкім 1996 годзе пазнаёміла нашага кіраўніка Міколу Аляксеевіча Козенку з таленавітымі людзьмі нашай вёскі – спевакамі і танцорамі. Запісаныя тады і ў наступныя гады песні і танцы мы і зараз выконваем на канцэртах і ў святах. Гэтыя песні вельмі простыя і ў той жа час глыбокія і прыгожыя. Наша салістка Маша Касцюкевіч у сваёй сольнай праграме спявае прыпеўку, запісаную некалі маёй мамай ад бабулі Вольгі Фёдараўны Сакавец, 1932 г.н.: «А баціначкі мае /Стуку не баяцца. /Пакуль буду малада – /Буду задавацца».

Аднойчы я пачуў, як нашы старэйшыя дзяўчынкі спяваюць масленічную песню: «Каля горада вада йшла, /А ў гародзе лінула, /Красна Светачка ўтанула. /Прыйшоў да яе татка яе: /Падай, Светачка, ручку мне. /-Не дам, татачка, ні аднае, /Не застануся я й табе. /Прыйшоў да яе Сашка яе: /-Падай, Светачка, ручку мне. / -На ж табе, Сашачка, хаця дзве, /Застануся ж я й табе». Калі я здзівіўся гэтаму супадзенню, кіраўнікі расказалі мне, што масленічныя песні спяваюць у нашай мясцовасці ў той хаце, дзе сёлета ажаніўся сын, і што калі запісвалі гэтую песню, то жанчыны-спявачкі якраз і прысвячалі яе маім маме і тату. Я вельмі ганаруся сваёй роднай вёскай, яе людзьмі, вельмі люблю сваю сям'ю. Хачу, каб былі здаровыя мае бацькі, каб заўсёды шчаслівай і вясёлай была мая любімая, лепшая на свеце мамачка – мой сябар і дарадчык, мая Настаўніца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ